**В. Карэла,**
рэдакцыя «ВШ»



# Некалькі жыццяў Юліі Чурко

У Беларускім універсітэце культуры і мастацтваў гэта незвычайная жанчына амаль што з самага заснавання. Столькі гадоў праляцела, а здаецца, вось яны, недалёка, тыя імклівыя радасці, прыемныя пачуцці, цяжкія выпрабаванні, страты і ўзлёты... Юлія Міхайлаўна Чурко прыйшла ў інстытут культуры ў 1975-м маладым доктарам навук, а да гэтага і пасля – цэлае жыццё.

...Балетная кар'ера вабіла яе з маленства. Тым больш што побач быў яркі прыклад: родная цётка – вядомая балерына 30-х Аляксандра Васільеўна Нікалаева. З сямі гадоў дзень за днём рыхтавала Юля сябе да пастаўленай мэты. Затым 10 гадоў самаахвярна займалася ў Беларускім харэаграфічным вучылішчы, а вынікам яе намаганняў стала работа ў трупе Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета БССР. Зграбная, прыгожая, толькі занадта сур'ёзная, яна выходзіла на сцэну, і зал замілавана вітаў яе. Але колькі сіл і мужнасці было ў лёгкіх рухах, грацыёзнай постаці, калі кожнае імгненне прыходзілася трымаць сябе, а *«дыханне не проста пачашчалася, яно замірала... і не магло пачаць рух,* – успамінае балерына. – *Чыстай лініі класічнага танца я дасягала непамернымі намаганнямі, якія не апраўдвалі сябе. Я напружвалася так, што жылы вылазілі і мазгі звараліся»*, – так зусім непаэтычна ахарактарызавала сваю зорную, але *«бязрадасную»* прафесію наша гераіня. Для яе кожнае новае выступленне станавілася сапраўдным актам мужнасці. Штодзень абяцала сабе выдатная артыстка Акадэмічнага пакінуць балет, але гэты намер затрымаўся на 12 гадоў. А поспехі былі: у двух пастаноўках выконвала вядучыя партыі, лічылася, што называецца, надзеяй тэатра. Але асэнсаваны ўчынак зроблены. Цяжкі час балетнай дзівы скончыў свой бясконцы бег. І яна з задавальненнем аддалася «адпачынку» – так называла сваё новае жыццё: *«Я на працягу пяці гадоў кожны дзень радавалася гэтаму, хаця ўсе мяне пераконвалі, што тэатр пакінуць нельга»,* – спакойна ўспамінае балерына. Тым не менш, гэта значная перамена не азначала прыпынак. Пачынаўся новы перыяд яе росту.

Разам з балетнай кар'ерай Ю. Чурко марыла стаць пісьменніцай. Таму яшчэ артысткай Нацыянальнага тэатра оперы і балета скончыла завочнае аддзяленне факультэта журналістыкі БДУ. А пасля наўмыснага завяршэння балетнай кар'еры, зусім невыпадкова яна стала мастацтвазнаўцай. Але галіна патрабавала больш глыбокіх прафесійных ведаў, што стала прычынай паступлення ў Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР. Ю.М. Чурко цалкам аддала сябе навуцы: у 28 гадоў стала кандыдатам, а ў 36 – ужо доктарам мастацтвазнаўства. Для рэалізацыі сваіх тэарэтычных пошукаў занялася педагагічнай дзейнасцю. Адразу – кансерваторыя, крыху пазней – педагагічны інстытут і інстытут культуры.

У Беларускім універсітэце культуры і мастацтваў, які сёлета адзначае сваё 30-годдзе, прафесар Чурко зрабіла сапраўды шмат: заснавала кафедру харэаграфіі, стварыла першую ў краіне галіновую лабараторыю беларускай танцавальнай творчасці. На працягу амаль дзесяці гадоў яна арганізоўвала і разам са студэнтамі ажыццяўляла пошукавыя экспедыцыі па збору і аднаўленню нацыянальнага харэаграфічнага фальклору. Калясілі па беларускіх вёсачках, па крупінках збіралі народную памяць праз абрады і танцы нашых продкаў. А ў інстытуцкіх сценах аднаўлялі гэты каштоўны матэрыял, каб захаваць і пакінуць нашчадкам. Відаць, невыпадкова студэнцкі фальклорна-танцавальны ансамбль, які быў створаны пры кафедры харэаграфіі, з разлікам на маладое пакаленне беларусаў называўся *«Унукі»*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Толькі сярод гэтай шматлікай разнастайнай педагагічнай і даследчай работы яе зноў і зноў цягнуў тэатр.

Асаблівым этапам у жыцці Ю.М. Чурко можна лічыць маштабную работу над пастаноўкай балета *«Кругабег»*. Гэта новы на сцэнічных падмостках праект. Аўтарам лібрэта і сапастаноўшчыкам яго стала Юлія Міхайлаўна, якая раней не мела практыкі пастаноўчай дзейнасці. Тым не менш, яе балады, дагэтуль як жанр не практыкаваныя на балетнай сцэне, з поспехам увасобіліся ў характарах 20-ці герояў. І адвечныя тэмы кахання, здрады, смерці адна за другой наводзілі гледача на думку аб спрадвечным колавым руху ўсіх працэсаў, з'яў, падзей, якія адбываюцца ў чалавечым жыцці. У гэтым філасофскі сэнс і нашага існавання, і асабістае светаўспрыманне аўтара. Работа над пастаноўкай была цяжкай, спусташальнай, нервовай і адказнай. Колькі сіл, эмоцый прыйшлося аддаць сваім героям, каб стварыць сапраўды яркія, выразныя вобразы. Крытыка ацаніла яе працу, што, магчыма, дало сілы для работы над новым балетам. Яна зноў стала аўтарам лібрэта, але пастаноўка *«Міфіста»*, якую ажыццяўляў В. Іваноў, народны артыст і сапастаноўшчык *«Кругабегу»*, не задаволіла перакананую ў сваім бачанні сцэнічных карцін Юлію Міхайлаўну. Таму гэтую старонку жыцця яна для сябе чарговы раз закрыла.



**Ю.М. Чурко на сцэне**

Вынікам многіх гадоў практычнай і тэарэтыка-навуковай работы ў мастацтве стала выданне 12 манаграфій па балеце, народна-сцэнічнаму танцу, фальклору, мадэрн-танцу, музычнаму тэатру і інш.: «*Я, як Жорж Санд, якая ўкладвала сваіх палюбоўнікаў у раманы, змяшчаю свае захапленні ў кнігі*», – адзначыла аўтар. А іх, як вы бачыце, было сапраўды шмат. І ўсе работы – пэўныя этапы жыцця праз асабістае вывучэнне, спасціжэнне, даследаванне. Пасля мастацтвазнаўства асаблівым захапленнем Юліі Чурко стала літаратурная дзейнасць. Таму зусім нечаканым было маё здзіўленне, калі на сустрэчу я ішла з балерынай, а мела размову, хутчэй, з пісьменніцай.

Яе выразная, каларытная міміка адразу прываблівае. А прэтэнзія на арыгінальнасць пацвярджаецца гібкім розумам, які востра рэагуе на ўсё, што паддаецца асэнсаванню. У асабістым арсенале ўсе магчымыя рэгаліі – Заслужаны дзеяч мастацтваў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, доктар мастацтвазнаўства, але характэрная ёй крытычная ўспрымальнасць заўсёды падштурхоўвала да новых відаў дзейнасці. І сёння шлях у літаратуру, які доўжыўся 35 гадоў, знаходзіць адлюстраванне ў вобразах яе герояў. Кнігі пісьменніцы разлічаны на маладога чытача, вывучаць звычкі і інтарэсы якіх у яе ёсць непасрэдная магчымасць і ў Акадэміі музыкі, і ва Універсітэце культуры і мастацтваў. А студэнт, у сваю чаргу, дае не толькі глебу для разважанняў, але і прымушае рухацца, шукаць, працаваць. Чым асабліва ганарыцца Юлія Міхайлаўна ў свае амаль 70 гадоў, што змагла нават асвоіць маладзёжны слэнг, які часцяком уключае ў творы, што чытач нават не здагадваецца хто іх аўтар. Акрамя таго, у асяроддзі маладых і *«сам маладзееш»*, – прызналася нам «доктар танца». Але камп'ютэр так і не асвоіла: *«Старую сабаку новым фокусам не абучыш*, – жартаўліва працытавала Юлія Міхайлаўна словы сваёй свекрыві. Яе самакрытычнасць неяк здзіўляе. Хаця, валодаючы ўсім магчымым, у тым ліку непахісным аўтарытэтам, можна з лёгкасцю выліць на сябе бруднае і застацца чыстым. Шок і эпатаж, характэрныя, па словах Ю.М. Чурко, нашаму часу, і асабліва мастацтву, у нейкай ступені ўласцівы і ёй як прадстаўніцы творчай прафесіі. І ў сваіх раманах неардынарнасцю мыслення, учынкаў герояў аўтар дасягае менавіта такіх вострых адчуванняў. *«Сёння мы іншыя, тэмпы жыцця іншыя. Мы не больш ведаем, але мы чуем больш, вастрэй успрымаем*, – ахарактарызавала яна нашу эпоху. – *І не трэба забывацца, што мастацтва – гэта проста павелічальнае шкло»*.

Сёння Ю.М. Чурко працуе ўжо над 3-й кнігай. Шукае новыя вобразы і герояў. Але балет глыбока ўвайшоў у кроў і плоць яе, што нават зараз мускулы адгукаюцца на знаёмыя такты. А літаратурныя творы ўздоўж і ўпоперак прасякнуты сцэнічным мастацтвам, так што ніводнае яе жыццё, як называе свае прафесійныя этапы наша гераіня, не было ізалявана. І балерына, і вучоны, і мастацтвазнаўца, і пастаноўшчык, і пісьменнік – усё апладатворана творчасцю. А ў жыцці, працытавала нам нечыя словы Ю.М. Чурко: *«Патрэбна рабіць тое, што лягчэй за ўсё даецца, але з максімальным напружаннем сіл»*, толькі тады яно прыносіць асалоду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ